# ЯК ПРАЦАВАЦЬ З ВУЧЭБНЫМ ДАПАМОЖНІКАМ

**Паважаныя вучні!**

Вы прыступаеце да вывучэння сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету. Абапірацца вы будзеце на веды, якія атрымалі раней. Гэта веданне асноў геаграфіі насельніцтва, гаспадаркі і спецыялізацыі рэгіёнаў і краін свету, іх прыродных рэсурсаў, асноўных эканамічных цэнтраў. Вы ведаеце, якія бываюць краіны паводле ўзроўню сацыяльна-эканамічнага развіцця.

Пасля вывучэння геаграфіі Беларусі вы ўжо зможаце расказаць пра асаблівасці насельніцтва нашай краіны, з якіх галін і відаў эканамічнай дзейнасці складаецца гаспадарчы комплекс Рэспублікі Беларусь, і растлумачыць, чаму склалася такая спецыялізацыя. Вы ўжо ўпэўнена арыентуецеся па карце нашай краіны і ведаеце, дзе знаходзяцца гарады, асноўныя эканамічныя цэнтры і галоўныя транспартныя артэрыі. Усе гэтыя веды дапамогуць вам пры вывучэнні сацыяльна-эканамічнай геаграфіі свету.

Ніводны раздзел геаграфічнай навукі не звязаны так цесна з развіццём грамадства і нашым паўсядзённым жыццём, як сацыяльна-эканамічная геаграфія. Кожная краіна і кожны жыхар планеты сваімі паўсядзённымі дзеяннямі — вытворчасць і спажыванне тавараў і паслуг, гандаль, міжнародныя эканамічныя зносіны — фарміруюць яе новы геаграфічны вобраз. Менавіта сацыяльна-эканамічная геаграфія свету з'яўляецца самым дынамічным і зменлівым раздзелам геаграфічнай навукі, які імкліва развіваецца.

Дадзены вучэбны дапаможнік складаецца з трох раздзелаў. У першым вы даведаецеся пра палітычную геаграфію і геапалітыку, пра найноўшыя працэсы на палітычнай карце свету, у тым ліку звязаныя з канфліктамі. Другі раздзел прысвечаны геаграфіі насельніцтва: асаблівасцям і заканамернасцям натуральнага руху насельніцтва, міжнароднай міграцыі, размяшчэння, рассялення і ўрбанізацыі. У трэцім раздзеле будуць раскрытыя асноўныя фактары развіцця сусветнай гаспадаркі, іх уплыў на геаграфію галін і відаў эканамічнай дзейнасці. Асаблівая ўвага нададзена пытанням геаграфіі сферы паслуг, бо яна найбольш актыўна развіваецца ў эпоху постындустрыялізацыі.

Для таго каб вам было лягчэй засвойваць вучэбны матэрыял, у кожны параграф уведзены рубрыкі.

У *пачатку параграфа* вам прапануюцца дзве рубрыкі. Рубрыка ***«Успомніце»*** патрэбная для актуалізацыі раней атрыманых ведаў, неабходных для далейшага вывучэння матэрыялу. Рубрыка ***«Для чаго мы гэта вывучаем?»*** змяшчае пытанні, якія раскрываюць практычную значнасць вучэбнага матэрыялу, або пытанні, звязаныя з вырашэннем праблем развіцця грамадства і свету.

У *тэксце параграфа* вы ўбачыце каляровыя знакі-сімвалы і рубрыкі. Новыя тэрміны і паняцці, абавязковыя для запамінання, вынесеныя на плашкі са значком  і вылучаныя паўтоўстым курсіўным шрыфтам. Іх таксама можна знайсці ў канцы вучэбнага дапаможніка ў рубрыцы **«Прадметны паказальнік»**. Краіны-лідары і іншыя

геаграфічныя аб'екты, якія неабходна ведаць і ўмець паказваць на карце, пазначаныя **чырвоным колерам**. *Курсівам* у тэксце вылучаныя некаторыя тэрміны і важныя сэнсавыя аспекты тэмы. Яны не патрабуюць абавязковага завучвання.

Рубрыка ***«У свеце ўсё ўзаемазвязанае»*** накіраваная на ўстанаўленне сувязей паміж вучэбнымі прадметамі, унутры геаграфічных навук, а таксама на выкарыстанне ведаў з навуковых галін, не звязаных з геаграфіяй. У рубрыцы ***«Паразважаем»*** прадстаўленыя заданні на вызначэнне прычынна-выніковых сувязей. Для тых, хто найбольш захоплены сацыяльна-эканамічнай геаграфіяй, мы падрыхтавалі рубрыку «**У свеце цікавага**» са знакам-сімвалам і дадатковай інфармацыяй пазнавальнага характару. А тым, хто вырашыць звязаць сваю будучую прафесію з эканамічнай геаграфіяй, мы прапаноўваем уступіць у ***«Клуб знаўцаў-эканомікагеографаў»***. У гэтай рубрыцы будуць прадстаўленыя звесткі інфармацыйна-пошукавага характару.

Якая ж геаграфія без карты! Яна заўсёды побач са знакам-сімвалам .

Для таго каб зразумець, якую пазіцыю ў свеце займае наша краіна — Рэспубліка Беларусь, у параграф уведзеная рубрыка «**Свет і Беларусь**» са знакам-сімвалам . Сучасную геаграфію сусветнай гаспадаркі ўжо немагчыма ўявіць без транснацыянальных кампаній (ТНК). Матэрыял пра іх вы сустрэнеце ў рубрыцы «**У свеце ТНК**» са знакам-сімвалам .

У *канцы параграфа* ўспомніць самае галоўнае дапаможа рубрыка ***«Падвядзём вынікі»***. За ёй ідуць некалькі рубрык з пытаннямі і заданнямі рознага ўзроўню для самакантролю і праверкі ведаў і ўменняў: ***«Праверым свае веды»***, ***«Ад простага да складанага»***, ***«Ад тэорыі да практыкі»***. Яны змяшчаюць рознаўзроўневыя пытанні, творчыя і праблемныя заданні. Рэсурсы сеткі Інтэрнэт па тэме даступныя па спасылцы qr.adu.by/sl/LLJFk5X2X і QR-кодзе. Іх выкарыстанне фарміруе навыкі крытычна ацэньваць, аналізаваць і прымяняць інфармацыю з сеткі для вырашэння рэальных задач.

Для ўрокаў абагульняльнага паўтарэння ў канцы раздзелаў прапанаваныя заданні трох відаў: ***«Праверым свае веды»***, ***«Папрацуем з атласам»*** і ***«Прагназуем»*** са знакам-сімвалам .

Знакам вылучаныя спасылкі на павышаны ўзровень.

Дадатковыя матэрыялы да вучэбнага дапаможніка можна знайсці на сайце http://eior.by (Адзіны інфармацыйна-адукацыйны рэсурс), калі выбраць у меню «10 клас» і прадмет «Геаграфія».